Водгук на аўтарэферат
дысертацыі Баярчук Т. М. «Межэтническая толерантность в современном белорусском обществе: социокультурное значение и перспективы развития».

Даследаванні асноўных рысаў нацыянальнага менталітэту з’яўляюцца актуальнымі і запатрабаванымі ў сучасным беларусазнаўстве і гуманітарных навуках у цэлым. Асабліва гэта датычыцца такога феномену, як талерантнасць, які стаў сапраўдным “брэндам” беларусаў і візітнай карткай нашай краіны у міжкультурных працэсах. У той жа час праблема развіцця міжэтнічнай талерантнасці як ў гістарычным аспекце, так і на сучасным этапе развіцця беларускага грамадства, была даследавана дастаткова слаба, не быў сфарміраваны асноўны тэрміналагічны апарат, а вызначэнне сутнасці талерантнасці зводзілася толькі да гістарычнага фактару, без аналізу філасофскіх і культуралагічных падыходаў. Як ні дзіўна, у сучасным беларусазнаўстве так і не было падрыхтавана глыбокае комплекснае даследаванне феномена талерантнасці беларускага грамадства, таму дысертацыя Т.М. Баярчук у гэтым плане з’яўляецца наватарскай і своечасовай.

У разглядаемай дысертацыі ўпершыню ў айчыннай гуманітарнай навуцы праведзена комплекснае абагульняючае даследаванне феномена міжэтнічнай талерантнасці беларускага грамадства праз прызму філасофска-тэарэтычнай рэканструкцыі праблемы. Аўтарам выяўлены пазітыўныя бакі талерантнасці і сацыяльныя праблемы, якія могуць узнікнуць пры яе адмоўным і безкантрольным выкарыстанні. Каштоўнасцю дысертацыі безумоўна з’яўляецца распрацоўка перспектываў развіцця аспектаў талерантнасці ў сучасным беларускім грамадстве і сістэмы захадаў па яе ўмацаванню. Палажэнні дысертацыі сфармуліраваны паслядоўна, лагічна, адпавядаюць прадстаўленаму ў аўтарэфераце зместу навуковай працы.

Пазітыўнай ацэнкі заслугоўвае выкарыстанне аўтарам вялікай колькасці крыніц па тэме даследавання, якія складаюць яго тэарэтыка-метадалагічны падмурак і ў поўнай ступені дапамагаюць раскрыць мэту і задачы. Суіскальніца вылучыла пяць груп крыніц, куды ўваходзяць працы класічнай еўрапейскай філасофіі, замежныя даследаванні па сацыяльнай антрапалогіі, этналогіі і тэорыі нацый, распрацоўкі беларускіх філосафаў, сацыёлагаў і гісторыкаў. Фактычна ўпершыню праводзіцца абагульненне розных падыходаў і канцэпцый адносна ролі міжэтнічнай талерантнасці ў жыцці беларускага грамадства, якія былі створаны ў апошнія дзесяцігоддзі.

Лічу, што дысертацыя Т.М. Баярчук з’яўляецца важным укладам у гуманітарную навуку, утрымлівае новую навуковую інфармацыю і безумоўна заслугоўвае становчай ацэнкі.

Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі
і спецыяльных гістарычных дысцыплін
ГрДУ імя Янкі Купалы,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.С. Горны

Подпись удостоверяю
Начальник отдела управления персоналом
учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»
С.В. Нестерович
12. 09. 2025 г.